# КНІГА ПРЫПОВЕСЬЦЯЎ

1 Прыповесьці Салямона, сына Давіда, валадара
Ізраіля,
2 каб спазнаць мудрасьць і настаўленьне, зразумець
словы розуму,
3 каб атрымаць настаўленьні ў разважлівасьці,
праведнасьці, судзе і справядлівасьці.
4 каб неразумным даць разумнасьць, юнаку — веды
і разважлівасьць.
5 Мудры няхай слухае і павялічвае веды, а разумны
няхай прыдбае мудрыя думкі,
6 каб зразумець выслоўе і прыповесьць, словы мудрых
і загадкі іхнія.
7 Страх перад ГОСПАДАМ — пачатак веданьня.
Неразумныя пагарджаюць мудрасьцю і
настаўленьнем.
8 Сыне мой, паслухай перасьцярогаў бацькі свайго і не
адкідай павучаньняў маці сваёй,
9 бо яны — прывабны вянок на галаве тваёй і
каштоўныя каралі на шыі тваёй.
10 Сыне мой, калі б цябе намаўлялі грэшнікі, не
далучайся да іх.
11 Калі яны скажуць: «Хадзем з намі! Зробім засаду
дзеля праліцьця крыві; наставім без прычыны пастку
на нявіннага;
12 праглынем іх жыўцом, як пекла, і цалкам, як тых,
што зыходзяць у магілу;
13 знойдзем усялякія каштоўнасьці, напоўнім дамы
свае здабычаю.
14 Жэрабя сваё кідай разам з намі, няхай адзін мех
будзе для нас усіх».

15 Сыне мой, не хадзі з імі, устрымай нагу сваю ад
сьцежкі іхняй,
16 боногі іхнія бягуць да злачынства і сьпяшаюцца на
праліцьцё крыві.
17 Бо надарэмна настаўляецца сетка на вачах усяго
птаства.
18 А яны цікуюць на ўласную кроў, робяць засаду
супраць душы? сваёй.
19 Такія вось сьцежкі кожнага, хто прагне чужога
даброцьця; яно забірае душу таго, хто завалодае ім.
20 Мудрасьць гукае на вуліцах, на плошчах узьнімае
голас свой,
21 на скрыжаваньнях шумлівых дарог кліча, у брамах
гарадзкіх гучаць яе словы:
22 «Дакуль, неразумныя, будзеце любіць
неразумнасьць; дакуль, насьмешнікі, будзеце
захапляцца насьмешкамі сваімі, а невукі —
пагарджаць веданьнем?
23 Зьвярніцеся да настаўленьня майго, і я выльлю на
вас духа майго, і абвяшчу вам словы мае.
24 Вось жа я клікала, але вы адмаўляліся, працягвала
руку сваю, але ніхто не зьвярнуў увагі.
25 Вы ўзгардзілі радай маёю і адкінулі дакараньні мае.
26 Дык і я буду сьмяяцца з вашага падзеньня, і
насьмяхацца буду, калі прыйдзе на вас жах.
27 Калі нахлыне жах, як бура, і загуба ваша, быццам
віхор, калі прыйдуць на вас трывога і гора,
28 тады будуць клікаць мяне, але я не адкажу, шукаць
мяне будуць, і ня знойдуць мяне.
29 Бо яны зьненавідзелі веданьне і ня выбралі для сябе
страху ГОСПАДАВА,
30 і не пайшлі за маімі парадамі, і ўзгардзілі маімі
перасьцярогамі.

31 Дык няхай ядуць яны плады шляху свайго і
насыцяцца намерамі сваімі.
32 Бо адступніцтва неразумных заб’е іх,
бяздумнасьць дурняў загубіць іх.
33 А хто слухае мяне, будзе жыць бясьпечна, будзе
спакойны, не баючыся зла».

# Разьдзел 2

1 Сыне мой, калі ты прыймеш словы мае і захаваеш у
сябе прыказаньні мае,
2 прыхіляючы вуха сваё да мудрасьці і схіляючы сэрца
сваё да разважлівасьці,
3 калі вось клікаць будзеш розум і голас свой
уздымеш, заклікаючы развагу,
4 калі шукаць яе будзеш як срэбра, і прагнуць яе
будзеш як багацьця,
5 тады зразумееш страх перад ГОСПАДАМ і знойдзеш
пазнаньне Бога.
6 Бо ГОСПАД дае мудрасьць, і з вуснаў Ягоных —
веданьне і разуменьне.
7 Ён захоўвае цьвярозы розум правым, Ён — шчыт
для тых, якія ходзяць беззаганна.
8 Ён пільнуе сьцежкі правасудзьдзя, захоўвае шляхі
багабойных Сваіх.
9 Тады зразумееш праведнасьць, суд і
справядлівасьць, і кожны добры шлях,
10 калі ўвойдзе мудрасьць у сэрца тваё, і веданьне
ўсьцешыць душу тваю.
11 Разважлівасьць будзе пільнаваць цябе, і розум
будзе захоўваць цябе,
12 каб выратаваць цябе ад шляху ліхога і ад чалавека,
які гаворыць хлусьліва,
13 ад тых, якія пакідаюць шлях просты, каб хадзіць
сьцежкамі цемры,

14 якія цешацца, робячы злое, і радуюцца з ліхіх
учынкаў,
15 у якіх шляхі крывыя і якія блукаюцца на сьцежках
сваіх,
16 каб выратаваць цябе ад чужой жанчыны і ад
чужаніцы, што лісьліва гаворыць,
17 якая пакінула сябра маладосьці сваёй і забылася на
запавет Бога свайго.
18 Бо дом яе нахіліўся да сьмерці, і шлях ейны — да
мёртвых;
19 усе, хто да яе ўваходзяць, назад не вяртаюцца і не
знаходзяць сьцежак жыцьця.
20 Дык хадзі ж ты шляхам добрых і трымайся сьцежкі
праведнікаў,
21 бо правыя будуць жыць на зямлі, і беззаганныя
застануцца на ёй.
22 А бязбожныя будуць вынішчаны з зямлі, ліхадзеі
будуць выкарэнены з яе.

# Разьдзел 3

1 Сыне мой, не забывайся настаўленьня майго, і няхай
сэрца тваё захоўвае прыказаньні мае,
2 бо доўгія дні, гады жыцьця і супакой прынясуць яны
табе.
3 Міласэрнасьць і праўда няхай не пакідаюць цябе,
абвяжы імі шыю сабе і напішы іх на табліцах сэрца
твайго,
4 і знойдзеш ты ласку і спагаднасьць у вачах Бога і
людзей.
5 Спадзявайся на ГОСПАДА ўсім сэрцам сваім і не
абапірайся на розум свой.
6 Думай пра Яго на ўсіх шляхах тваіх, і Ён выпрастуе
сьцежкі твае.

7 Ня будзь мудры ў вачах сваіх, бойся ГОСПАДА і
пазьбягай ліхоты.
8 Гэта будзе здароўем для цела твайго і спасіленьнем
косткам тваім.
9 Шануй ГОСПАДА ўсёй маёмасьцю тваёй і пяршынамі
ўсіх пладоў тваіх,
10 і напоўняцца гумны твае збожжам, а тоўчні твае
перапоўняцца новым віном.
11 Не адкідай, сыне мой, настаўленьня ГОСПАДАВА, і
не ўхіляйся, калі Ён дакарае цябе,
12 бо каго любіць ГОСПАД, таго карае, як бацька, які
спагадае сыну.
13 Шчасьлівы чалавек, які знайшоў мудрасьць, і
чалавек, які прыдбаў разуменьне.
14 Бо здабыць яе лепш, чым здабыць срэбра, і плады
ейныя лепшыя за золата.
15 Яна — каштоўнейшая за пэрліны, і нішто з
таго, што ты прагнеш, ня можа параўнацца з ёю.
16 Доўгасьць дзён у правай руцэ яе, а ў левай руцэ —
багацьце і слава.
17 Шляхі яе — шляхі прыемныя, і ўсе сьцежкі
ейныя — супакой.
18 Яна — дрэва жыцьця для тых, што трымаюцца
яе, шчасьлівыя тыя, якія абапіраюцца на яе.
19 ГОСПАД мудрасьцю заснаваў зямлю, нябёсы
ўмацаваў розумам.
20 Яго веданьнем расчыніліся бяздоньні і аблокі
імгляць расою.
21 Сыне мой, няхай гэта не адыходзіць ад вачэй тваіх,
захоўвай разумнасьць і разважнасьць.
22 І яны стануцца жыцьцём для душы тваёй і аздобаю
для шыі тваёй.
23 Тады пойдзеш бясьпечна шляхам сваім, і нага твая
не пахісьнецца.

24 Калі ляжаш спаць, ня будзеш мець страху, і калі засьнеш, сон твой будзе салодкі.
25 Не спалохаешся раптоўнага страху і загубы бязбожнікаў, калі яна прыйдзе,
26 бо ГОСПАД будзе тваім спадзяваньнем і захавае нагу тваю ад пасткі.
27 Не адмаўляй у дабрадзействе таму, хто патрабуе, калі рука твая мае сілу зрабіць гэта.
28 Не кажы бліжняму твайму: «Ідзі сабе і прыйдзі зноў, заўтра дам табе», калі маеш гэта пры сабе.
29 Не надумляй ліхоцьця супраць бліжняга твайго, калі ён жыве пры табе бясьпечна.
30 Не сварыся з чалавекам без прычыны, калі ён не зрабіў табе нічога благога.
31 Не зайзросьці чалавеку злачыннаму і не выбірай ніводнага з шляхоў яго,
32 бо ГОСПАД брыдзіцца крывадушным, а з правымі Ён сябруе.
33 Праклён ГОСПАДАЎ на доме бязбожніка, але жытло праведных Ён дабраслаўляе.
34 Ён сьмяецца з насьмешнікаў, а пакорным ласку дае.
35 Мудрыя атрымаюць у спадчыну славу, а бязглуздыя насіць будуць ганьбу.

# Разьдзел 4

1 Слухайце, дзеці, настаўленьне бацькі і ўважайце, каб навучыцца розуму,
2 бо я даю вам добрую навуку; не пакідайце закону майго.
3 Бо і я быў сы?нам у бацькі майго, пешчаны і адзіны ў маці маёй.

4 I ён вучыў мяне, і казаў мне: «Няхай трымаецца
сэрца тваё словаў маіх, захоўвай прыказаньні мае і
жыві.
5 Набывай мудрасьць, набывай розум, не забывайся і
не ўхіляйся ад словаў вуснаў маіх.
6 Не пакідай яе, і яна захавае цябе, любі яе, і яна будзе
пільнаваць цябе.
7 Галоўнае — мудрасьць; набывай мудрасьць, і за
ўсю маёмасьць сваю набывай розум.
8 Узьвяліч яе, і яна падыме цябе, яна праславіць цябе,
калі ты ўхопішся за яе,
9 ускладзе на галаву тваю вянок ласкі, аздобіць цябе
каронаю славы».
10 Слухай, сыне мой, і прыймі словы мае, і
памножацца гады жыцьця твайго.
11 Я паказваю табе шлях мудрасьці, вяду цябе
сьцежкамі праведнасьці.
12 Калі пойдзеш імі, ня будуць блытацца ногі твае,
калі пабяжыш, не спатыкнешся.
13 Трымайся настаўленьня, не занядбоўвай, захоўвай
яго, бо яно — жыцьцё для цябе.
14 Не ўзыходзь на сьцежку бязбожнікаў і не хадзі па
шляху ліхотнікаў,
15 пазьбягай яго і не хадзі па ім, ухіляйся ад яго і
абмінай яго,
16 бо не заснуць яны, калі ня ўчыняць благога, і сон іх
ня возьме, калі не давядуць каго да падзеньня.
17 Бо ядуць яны хлеб беззаконьня і п’юць віно
гвалту.
18 Але сьцежка праведных — як сьвятло зараніцы,
што ўзыходзіць і расьце аж да поўнага дня.
19 Шлях бязбожнікаў цёмны, яны ня ведаюць, дзе
спатыкнуцца.
20 Сыне мой, зважай на словы мае, прыхілі вуха тваё

да прамоваў маіх.
21 Няхай не зыходзяць яны з вачэй тваіх, захоўвай іх
у глыбіні сэрца твайго,
22 бо яны — жыцьцё для таго, хто знайшоў іх, і
здароўе для ўсяго цела яго.
23 З усёй стараннасьцю захоўвай сэрца сваё, бо з яго
крыніца жыцьця.
24 Адкінь ад сябе вусны хлусьлівыя, аддалі ад сябе
язык крывадушны.
25 Вочы твае няхай глядзяць проста, а павекі твае
няхай скіраваныя будуць перад табою.
26 Абдумай сьцежку для ног тваіх, і ўсе шляхі твае
няхай будуць пэўныя.
27 Не зыходзь ані направа, ані налева, аддалі нагу тваю
ад ліхоцьця.

# Разьдзел 5

1 Сыне мой, зважай на мудрасьць маю, прыхілі вуха
тваё да розуму майго,
2 каб меў ты разважлівасьць, і вусны твае захавалі
веданьне.
3 Бо вусны распусьніцы ацякаюць мёдам, і
паднябеньне яе мякчэйшае за алей,
4 але канец яе горкі, як палын, і востры, як меч
двусечны.
5 Ногі ейныя да сьмерці зыходзяць, а стопы ейныя на
пекла абапіраюцца.
6 Як яна не разумее сьцежкі жыцьця, дык хістаюцца
крокі яе, і ты ня можаш ведаць іх.
7 Дык вось цяпер, дзеці, паслухайце мяне, і не
адыходзьцеся ад словаў вуснаў маіх.
8 Аддалі ад яе шлях твой, і не падыходзь да дзьвярэй
дому яе,

9 каб не аддаць годнасьці сваёй іншым і гадоў сваіх —
бязьлітаснаму,
10 каб не сыцелі чужынцы з сілы тваёй, і з працы тваёй
— у доме чужым.
11 І будзеш ты потым стагнаць, калі будуць
зьняможаныя цела тваё і сілы твае.
12 І ты скажаш: «Чаму я зьненавідзеў настаўленьне, і
сэрца маё ўзгардзіла дакараньнем.
13 Ня слухаў я голасу настаўнікаў сваіх, і не прыхіляў
я вуха свайго да тых, што вучылі мяне.
14 Ледзь ня трапіў я ў вялікае няшчасьце сярод
грамады? і народу!»
15 Пі ваду са сваёй крыніцы, тую, што цячэ з твайго
калодзежу.
16 Навошта крыніцам тваім разьлівацца на вуліцы, а
ручаям цячы па плошчах?
17 Няхай яны служаць толькі табе, а не чужынцам
разам з табою.
18 Няхай крыніца твая будзе дабраслаўлёная, і цешся
жонкай маладосьці тваёй.
19 Яна — ланя ласкавая і сарна прыгожая, ейныя
грудзі няхай поюць цябе ва ўсякую часіну, у каханьні
яе мей асалоду заўсёды.
20 Навошта табе, сыне мой, захапляцца распусьніцай
і абдымаць улоньне чужаніцы?
21 Бо перад вачамі ГОСПАДА шляхі чалавека, Ён ведае
ўсе крокі яго.
22 Бязбожніка схопяць ягоныя ўласныя правіны, і ён
зьвязаны путамі грахоў сваіх.
23 Ён памрэ без настаўленьня і будзе блукаць дзеля
вялікай глупоты сваёй.

# Разьдзел 6

1 Сыне мой, калі ты ручаўся за бліжняга твайго і даў

руку тваю за чужога,
2 ты спутаў сябе словамі вуснаў сваіх, і ты злоўлены словамі вуснаў тваіх.
3 Дык зрабі, што раю, сыне мой, і вызвалі сябе, бо ты трапіў у рукі бліжняга твайго: бяжы, упадзі да ног і ўпрошвай бліжняга свайго,
4 не давай сну вачам тваім і спачынку павекам тваім,
5 вырывайся, як сарна з рукі і як птушка з рукі птушкалова.
6 Ідзі да мураша, гультаю, і паглядзі на шляхі ягоныя, і станься мудрым.
7 Няма ў яго начальніка, ані наглядчыка, ані кіраўніка,
8 але ён летам загатаўляе хлеб сабе і зьбірае сваю ежу ў жніво.
9 Як доўга, гультаю, будзеш спаць? Калі ты ўстанеш ад сну свайго?
10 Крыху пасьпіш, крыху падрэміш, крыху, склаўшы рукі, паляжыш,
11 і прыйдзе, як валацуга, беднасьць твая, і нястача твая, як чалавек узброены.
12 Чалавек нягодны, чалавек злачынны ходзіць з хлусьлівымі вуснамі,
13 лыпае вачыма сваімі, круціць нагамі сваімі, пальцамі сваімі знакі дае,
14 хавае ліхоту ў сэрцы сваім, увесь час прыдумляе благое, сваркі расьсявае.
15 Таму зьнянацку прыйдзе на яго загуба, раптоўна будзе зьнішчаны, і ня будзе яму аздараўленьня.
16 Вось шэсьць, якіх ненавідзіць ГОСПАД, і сем, якія агідныя для душы Яго:
17 вочы пыхлівыя, язык хлусьлівы, рукі, што праліваюць кроў нявінную,

18 сэрца, якое задумвае намеры зласьлівыя, ногі, што
хутка бягуць на благое,
19 сьведка фальшывы, які дыхае няпраўдай, і той, хто
сее нязгоду між братамі.
20 Сыне мой, захавай прыказаньні бацькі твайго і не
пакідай закон маці тваёй,
21 навяжы іх назаўсёды на сэрцы тваім і абвяжы імі
шыю тваю.
22 Калі пойдзеш, яны павядуць цябе, калі ляжаш
спаць, будуць пільнаваць цябе, калі прабудзішся,
будуць гаварыць да цябе.
23 Бо прыказаньне — сьветач, і закон — сьвятло, а
настаўленьне і дакараньне — шлях жыцьця,
24 каб захаваць цябе ад жанчыны ліхой, ад ліслівага
языка чужаніцы.
25 Няхай не пажадае сэрца тваё прыгажосьці яе, няхай
ня ўхопіць яна цябе вейкамі сваімі,
26 бо з прычыны распусьніцы галеюць да бохана
хлеба, і чужаложніца цікуе на дарагую душу.
27 Ці схавае хто агонь у запазуху, каб не загарэлася
адзеньне ягонае?
28 Ці можа хто хадзіць па распаленым вугольлі, не
апёкшы ступняў сваіх?
29 Так і той, хто ўваходзіць да жонкі бліжняга свайго,
хто дакранаецца да яе, не пазьбегне кары.
30 Не пагарджаюць злодзеем, калі ён крадзе, каб
насыціць душу сваю, калі ён галодны,
31 але злоўлены, сямікроць аддасьць, аддасьць усю
маёмасьць дому свайго.
32 Хто чужаложыць з жанчынаю, той бязглузды,
загубіць душу сваю той, хто гэтак чыніць.
33 Біцьцё і сорам знойдзе ён сабе, і ганьба яго ня
змыецца,

34 бо рэўнасьць раз'юшвае мужа, і не пашкадуе ён у
дзень помсты,
35 ня гляне ён на ніякую аднагароду і адкіне дары,
хоць іх павялічыш.

# Разьдзел 7

1 Сыне мой, прыймі словы мае і захоўвай у сабе
прыказаньні мае.
2 Захоўвай прыказаньні мае і жыві, і закон мой — як
зрэнку вока твайго.
3 Навяжы іх на пальцы твае, напішы іх на табліцах
сэрца твайго.
4 Скажы мудрасьці: «Ты — сястра мая», і розум
назаві сябрам,
5 каб яны захавалі цябе ад чужой жонкі, ад чужаніцы,
што гаворыць лагодныя словы.
6 Вось, глядзеў я праз вакно дому свайго, праз краты
свае,
7 і ўбачыў сярод неразумных, заўважыў сярод
маладых людзей юнака легкадумнага,
8 як праходзіў вуліцай каля рогу яе, як ішоў дарогаю ў
дом яе,
9 у поцемках, у позьні час, у начной цемры і змроку.
10 І вось выходзіць насустрач яму жанчына, у
распусным адзеньні, з падступным сэрцам,
11 галасьлівая і нястрыманая, ногі яе не бываюць у
доме яе:
12 ці то на вуліцы, ці то на плошчы, і на кожным рагу
растаўляе пасткі.
13 І схапіла яго, цалавала яго, і з бессаромным тварам
казала яму:
14 «У мяне ахвяра мірная, сёньня споўніла абяцаньні
мае,
15 таму выйшла на спатканьне табе, прагнула бачыць
аблічча твае і знайшла цябе.

16 Дыванамі я заслала ложак мой, шматколернымі
тканінамі з Эгіпту,
17 пакой мой пасыпала мірам, альвасам і цынамонам.
18 Прыйдзі, будзем цешыцца пяшчотамі да раніцы,
атрымліваць асалоду ад каханьня.
19 Бо няма мужа ў доме, выбраўся ў далёкую дарогу,
20 капшук з грашыма ўзяў з сабою, у дзень поўні
месяца мае вярнуцца дамоў».
21 Мноствам ласкавых словаў прывабіла яго,
лісьлівасьцю вуснаў сваіх зьвяла яго.
22 Ён адразу пайшоў за ёю, як вол, ведзены на зарэз,
як бязглузды, на ланцугу ведзены на пакараньне,
23 аж пакуль страла праб’е вантробы яго; як
птушка, што кідаецца ў сіло, і ня ведае, што на загубу
яе.
24 Дык цяпер, дзеці, паслухайце мяне, і зважайце на
словы вуснаў маіх.
25 Няхай не схіляецца сэрца тваё да шляхоў яе, і не
блукай па сьцежках яе,
26 бо шматлікія пакалечаныя ёю, і мноства магутных
яна загубіла.
27 Дом ейны — шлях у пекла, які вядзе ў сутарэньні
сьмерці.

# Разьдзел 8

1 Ці ж мудрасьць ня кліча? Ці ж розум ня ўзносіць
голас свой?
2 На вяршынях гораў, пры дарозе, на ростанях стаіць
яна,
3 ля брамаў, пры ўваходзе ў горад, пры дзьвярах кліча
яна.
4 «Да вас, людзі, я клічу, да сыноў чалавечых голас
мой!

5 Навучыцеся, неразумныя, цьвярозаму мысьленьню,
і вы, бязглуздыя, прыдбайце разумнае сэрца.
6 Слухайце, бо буду гаварыць пра рэчы важныя,
і расчыняцца вусны мае, каб сказаць рэчы
справядлівыя.
7 Бо праўду выкажа язык мой, і няправасьць —
брыдота для вуснаў маіх.
8 Выслоўі вуснаў маіх справядлівыя, няма ў іх хлусьні
і крывадушнасьці.
9 Усе яны простыя для разумнага і правыя для тых,
што знайшлі веданьне.
10 Прыйміце настаўленьне маё, а ня срэбра, лепш
веды, чым чыстае золата,
11 бо мудрасьць лепшая за пэрлы, і ніякія
каштоўнасьці не параўнаюцца з ёю.
12 Я, мудрасьць, жыву разам з цьвярозым
мысьленьнем і шукаю веданьня з разважнасьцю.
13 Страх перад ГОСПАДАМ — ненавідзець ліхоту,
пыху і фанабэрыстасьць, ліхія шляхі і крывадушныя
вусны я ненавіджу.
14 У мяне рада і сапраўдная мудрасьць, я — розум, у
мяне сіла.
15 Дзякуючы мне валадары валадараць і князі
дзейнічаюць справядліва.
16 Дзякуючы мне начальнікі кіруюць, і магнаты, і ўсе
судзьдзі зямлі.
17 Я люблю тых, якія мяне любяць, і тыя, што мяне
шукаюць, знойдуць мяне.
18 У мяне багацьце і слава, незьнішчальныя скарбы і
праведнасьць.
19 Плод мой лепшы за золата, і золата
найчысьцейшае, і карысьць ад мяне лепшая за срэбра
адборнае.
20 Я хаджу сьцежкамі праведнасьці і шляхамі
правасудзьдзя,

21 каб даць тым, што любяць мяне, у спадчыну
даброцьці, і скарбніцы іх я напоўню.
22 ГОСПАД меў мяне на пачатку шляху Свайго, раней
стварэньняў Сваіх, спакон вякоў.
23 Спрадвеку я пастаўлена, ад пачатку, перш, чым
зямля паўстала.
24 Я нарадзілася, калі яшчэ не было бяздоньняў, калі
не было крыніцаў, напоўненых водамі.
25 Перш, чым горы былі асаджаны, перад узгоркамі я
нарадзілася,
26 калі Ён яшчэ не стварыў ані зямлі, ані палёў, ані
пачатковых пылінак сусьвету.
27 Калі Ён прыгатоўваў нябёсы, я была там. Калі Ён
крэсьліў скляпеньне над абліччам бяздоньня,
28 калі засноўваў аблокі ўгары?, калі ўмацоўваў
крыніцы бяздоньня,
29 калі вызначаў для мора статут ягоны, каб воды не
перакрочвалі рубяжы свае, калі закладаў падваліны
зямлі,
30 я была ў Яго дойлідам і была пацехай [Яго] кожны
дзень, радуючыся перад абліччам Яго кожны час,
31 радуючыся на заселенай зямлі Яго, і пацеха мая —
з сынамі чалавечымі.
32 Дык цяпер, дзеці, паслухайце мяне, і шчасьлівыя
тыя, якія трымаюцца шляхоў маіх.
33 Слухайце настаўленьне, і будзеце мудрымі, і не
адкідайце яго.
34 Шчасьлівы чалавек, які слухае мяне, чуваючы
кожны дзень пры брамах маіх, стоячы на варце пры
парозе дзьвярэй маіх.
35 Бо хто знойдзе мяне, знойдзе жыцьцё і атрымае
ласку ад ГОСПАДА,
36 а хто грашыць супраць мяне, шкодзіць душы сваёй;
усе, якія ненавідзяць мяне, любяць сьмерць».

# Разьдзел 9

1 Мудрасьць пабудавала сабе дом, вычасала сем слупоў яго,

2 закалола тое, што было на зарэз, зьмяшала віно і прыгатавала свой стол.

3 Паслала служак сваіх, кліча на дзядзінцу і на вышынях гарадзкіх:

4 «Хто неразумны, няхай прыйдзе сюды», а да бязглуздага кажа:

5 «Прыходзьце, ешце хлеб мой і піце віно, якое я зьмяшала,

6 пакіньце дурноту і жывіце, і хадзіце шляхам розуму».

7 Хто павучае насьмешніка, сьцягвае на сябе прыкрасьць, а хто дакарае бязбожніка, запляміцца.

8 Не дакарай насьмешніка, каб ён не зьненавідзеў цябе, дакарай мудрага, і ён будзе любіць цябе.

9 Настаўляй мудрага, і ён стане мудрэйшы, вучы праведнага, і ён павялічыць веды.

10 Пачатак мудрасьці — страх ГОСПАДАЎ, і веданьне Сьвятога — розум.

11 Бо праз мяне памножацца дні твае і дададуцца гады жыцьця твайго.

12 Калі будзеш мудры, для сябе будзеш мудры, а калі станеш насьмешнікам — сам будзеш мець шкоду.

13 Дурнота — жанчына крыклівая, неразумная і нічога ня ведае;

14 сядзіць ля дзьвярэй дому свайго на пасадзе, на вышынях гарадзкіх,

15 каб клікаць тых, што праходзяць дарогаю, што ідуць проста сьцежкамі сваімі:

16 «Хто неразумны, няхай прыйдзе сюды», а да бязглуздага кажа:

17 «Вада крадзеная салодкая, і схаваны хлеб
смачнейшы».
18 І ня ведае той, што там мерцьвякі, і што ў цемры
адхлані запрошаныя ёю.

# Разьдзел 10

1 Прыповесьці Салямона. Мудры сын — радасьць
для бацькі, а дурны сын — гора для маці.
2 Не прыносяць карысьці скарбы бязбожныя, а
праведнасьць ратуе ад сьмерці.
3 Не дазволіць ГОСПАД галадаваць душы праведніка,
але адкіне жаданьні бязбожнікаў.
4 Лянівая рука робіць бедным, а рука працавітая
ўзбагачае.
5 Хто летам зьбірае, той сын разважлівы, а хто сьпіць
у жніво — сын ганебны.
6 Дабраславенствы — на галаве праведнага, а
вусны бязбожнікаў хаваюць няправасьць.
7 Памяць пра праведніка дабраслаўлёная, а імя
бязбожнікаў спарахнее.
8 Мудры сэрцам прыймае прыказаньні, а той, хто мае
вусны неразумныя, упадзе.
9 Хто ходзіць беззаганна, той ходзіць бясьпечна, а хто
кры?віць шляхі свае, будзе выяўлены.
10 Хто міргае вачыма, той робіць прыкрасьць, а той,
хто мае вусны неразумныя, упадзе.
11 Вусны праведніка — крыніца жыцьця, а вусны
бязбожнікаў хаваюць няправасьць.
12 Нянавісьць выклікае сваркі, а любоў пакрывае ўсе
правіны.
13 У вуснах разумнага знаходзіцца мудрасьць, а кій —
на сьпіне бязглуздага.
14 Мудрыя захоўваюць веданьне, а вусны неразумнага
вядуць да загубы.

15 Маёмасьць багатага — умацаваны горад для
яго, загуба для бедных — іхняя галеча.
16 Праца праведніка вядзе да жыцьця, набытак
бязбожніка — да грэху.
17 На сьцежцы жыцьця той, хто прыймае
настаўленьне, а хто адкідае дакараньне — блукае.
18 Хто хавае нянавісьць, у таго вусны хлусьлівыя, а хто
паклёп разносіць, той дурань.
19 У мностве словаў не пазьбегнеш грэху, а хто
стрымлівае вусны свае, той разважлівы.
20 Язык праведніка — адборнае срэбра, а сэрца
бязбожніка нічога ня вартае.
21 Вусны праведнага пасьвяць многіх, а бязглуздыя
паміраюць ад нястачы розуму.
22 Дабраславенства ГОСПАДАВА, яно ўзбагачае, і
смутку з сабою не прыносіць.
23 Радасьць для дурня — учынкі ганебныя, а для
чалавека разумнага — мудрасьць.
24 Тое, чаго баіцца бязбожнік, прыйдзе на яго, а
прагненьні праведных споўняцца.
25 Калі пранясецца віхор, дык і ня будзе больш
бязбожніка, а праведнік мае вечны падмурак.
26 Як воцат для зубоў і як дым для вачэй, так гультай
для тых, што яго пасылаюць.
27 Страх ГОСПАДАЎ памнажае дні, а гады бязбожнікаў
скароцяцца.
28 Чаканьне праведнікаў — радасьць, а
спадзяваньне бязбожнікаў загіне.
29 Шлях ГОСПАДАЎ — апора для беззаганных і
загуба для злачынцаў.
30 Праведнік не пахісьнецца навекі, а бязбожнікі ня
будуць жыць на зямлі.
31 Вусны праведніка памнажаюць мудрасьць, а язык

падступны будзе адсечаны.
32 Вусны праведніка ведаюць, што даспадобы [Богу], а
вусны бязбожнікаў — падступнасьць.

# Разьдзел 11

1 Агіда для ГОСПАДА — шалі падманлівыя, а вагі
дакладныя даспадобы Яму.
2 Прыходзіць пыхлівасьць, прыходзіць і ганьба, а ў
пакорлівых — мудрасьць.
3 Беззаганнасьць правых вядзе іх, а крывадушнасьць
здрадлівых загубіць іх.
4 Не дапаможа багацьце ў дзень гневу, а праведнасьць
ратуе ад сьмерці.
5 Праведнасьць беззаганнага раўняе шлях ягоны, а
бязбожнік падае праз бязбожнасьць сваю.
6 Праведнасьць правых ратуе іх, а ліхадзеі будуць
злоўленыя злачынствам сваім.
7 Калі памірае чалавек бязбожны, гіне надзея [яго], і
спадзяваньне злачынцаў прападае.
8 Праведнік ратуецца ад бяды, а бязбожнік прыходзіць
на месца яго.
9 Крывадушнік вуснамі забівае бліжняга свайго, а
праведнік ратуецца праз веданьне.
10 Калі добра ідзе праведным, радуецца горад, і калі
гінуць бязбожнікі, сьвяткуе.
11 Дабраславенствам правых узвышаецца горад, а
вуснамі бязбожнікаў руйнуецца.
12 Той, хто пазбаўлены розуму, пагарджае бліжнім
сваім, а чалавек разумны захоўвае мір.
13 Хто ходзіць з абмовамі, адкрывае таямніцу, а той,
хто верны духам, захоўвае слова.
14 Дзе няма добрай рады, народ прападае, а пры
мностве дарадцаў — выратаваньне.

15 Шкодзіць сабе той, хто паручаецца за чужога, а хто
ненавідзіць даваць руку, той бясьпечны.
16 Пачцівая жанчына здабывае славу, і моцныя
здабываюць багацьце.
17 Чалавек міласэрны робіць дабро душы сваёй, а
бязьлітасны нішчыць цела сваё.
18 Падманлівы набытак здабудзе бязбожнік, а таму,
хто сее праведнасьць, будзе пэўная нагарода.
19 Праведнасьць [вядзе] да жыцьця, а хто імкнецца да
зла, [імкнецца] да сьмерці.
20 Агіда для ГОСПАДА крывадушныя сэрцам, але тыя,
хто ходзяць беззаганна, даспадобы Яму.
21 Можна паручы?цца, зло не пазьбегне пакараньня, а
насеньне праведных будзе збаўленае.
22 Як залатое колца ў лычы сьвіньні, так прыгожая
жанчына, але бяз розуму.
23 Прагненьне праведнікаў — толькі дабро, а
чаканьне бязбожнікаў — гнеў.
24 Адзін сыпе [шчодра], і дадаецца яму, а другі лішне
ашчадны, і бяднее.
25 Дабрадзейная душа будзе насычана, і хто поіць
[другіх], сам напоены будзе.
26 Хто затрымлівае збожжа, таго праклінае народ, але
дабраславенства на галаве таго, хто продае.
27 Хто імкнецца да дабра, той шукае зычлівасьці, а хто
шукае зла, да таго яно прыйдзе.
28 Хто спадзяецца на багацьце сваё, упадзе, а
праведнікі, як лісьце, зелянеюць.
29 Хто руйнуе дом свой, атрымае ў спадчыну вецер, і
неразумны будзе слугою мудрага сэрцам.
30 Плод праведнага — дрэва жыцьця, і мудры
здабывае душы.

31 Вось, праведнік будзе мець адплату на зямлі,
пагатоў бязбожнік і грэшнік.

# Разьдзел 12

1 Хто любіць настаўленьне, любіць веданьне, а хто
ненавідзіць дакараньне, той дурань.
2 Добры знойдзе ласку ў ГОСПАДА, але чалавека
зламыснага Ён асудзіць.
3 Ня будзе стаяць чалавек бязбожнасьцю, а корань
праведных не захістаецца.
4 Дабрадзейная жонка — карона для мужа свайго,
а бессаромная — як гніль у костках ягоных.
5 Думкі праведных слушныя, намеры бязбожнікаў
падступныя.
6 Словы бязбожнікаў цікуюць на кроў, але вусны
правых ратуюць іх.
7 Паваленыя бязбожнікі, і няма іх, а дом праведных
будзе стаяць.
8 Хваляць чалавека паводле розуму ягонага, але той,
хто мае ліхое сэрца, будзе пагарджаны.
9 Лепей быць простым і працаваць на сябе, чым
выдаваць сябе за паважнага і ня мець хлеба.
10 Праведнік руціцца пра жыцьцё быдла свайго, а
нутро бязбожных бязьлітаснае.
11 Хто абрабляе сваю зямлю, той насыціцца хлебам, а
хто ганяецца за марнасьцю, той ня мае розуму.
12 Бязбожнік жадае [злавіць у] пасткі ліхоцьця, а
корань праведных прыносіць [плод].
13 Ліхадзей заблытаецца праз правіны вуснаў сваіх, а
праведнік выйдзе з бяды.
14 З плоду вуснаў сваіх чалавек насыціцца дабром, і
праца рук чалавека зьвернецца да яго.

15 Шлях неразумнага слушны ў вачах ягоных, але
мудры той, хто слухае параду.
16 Гнеў неразумнага выяўляецца адразу, а разумны
хавае зьнявагу.
17 Хто дыхае праўдаю, той выкажацца праўдзіва, а
сьведка фальшывы хлусіць.
18 Ёсьць такі, што лапоча і раніць як мечам, а язык
мудрага лечыць.
19 Вусны праўдамоўныя трываць будуць вечна, а язык
хлусьлівы — імгненьне.
20 Ашуканства ў сэрцы тых, якія задумляюць ліхоту, а
ў тых, якія радзяць мір, — радасьць.
21 Не спаткае праведніка нічога благога, а ў
бязбожніка будзе поўна няшчасьцяў.
22 Агіда для ГОСПАДА вусны хлусьлівыя, а тыя, што
дзейнічаюць сумленна, падабаюцца Яму.
23 Чалавек разумны прыхоўвае веданьне, а сэрца
дурняў абвяшчае глупства.
24 Рука руплівых будзе мець уладу, а нядбайныя
будуць даньнікамі.
25 Смутак у сэрцы чалавека прыгнятае яго, а добрае
слова разьвяселіць яго.
26 Праведнік мае перавагу над бліжнім сваім, а шлях
бязбожнікаў зводзіць іх саміх.
27 Гультай не сьпячэ ўпаляванага, а маёмасьць
чалавека руплівага каштоўная.
28 На сьцежцы праведнасьці — жыцьцё, і на шляху
яе няма сьмерці.

# Разьдзел 13

1 Мудры сын [слухае] настаўленьне бацькі, а
насьмешнік ня слухае дакараньня.
2 З плоду вуснаў сваіх чалавек будзе жывіцца дабром,
а душа ліхадзеяў — гвалтам.

3 Хто захоўвае вусны свае, захоўвае душу сваю, а хто
шырока адкрывае свой рот, будзе мець зьнішчэньне.
4 Душа гультая жадае і ня мае нічога, а душа руплівага
будзе насычаная.
5 Праведнік ненавідзіць слова хлусьлівае, а бязбожнік
ганьбіць і зьневажае [сябе].
6 Праведнасьць захоўвае таго, хто беззаганны ў шляху
[сваім], а бязбожнасьць губіць грэшніка.
7 Адзін выдае сябе за багатага, нічога ня маючы, іншы
выдае сябе за беднага, маючы шмат багацьця.
8 Выкуп душы чалавека — багацьце ягонае, а бедны
пагрозы ня чуе.
9 Сьвятло праведных радасна зьзяе, а сьветач
бязбожнікаў стухне.
10 Пыхлівасьць толькі да звадкі прыводзіць, а ў тых,
што парады прыймаюць, — мудрасьць.
11 Багацьце, [здабытае] марным чынам, змалее, а хто
зьбірае яго рукою сваёю, — памнажае яго.
12 Спадзяваньне, якое доўжыцца, — боль сэрца, а
зьдзейсьненае жаданьне — дрэва жыцьця.
13 Хто пагарджае Словам, той будзе зьнішчаны, а хто
баіцца прыказаньняў, атрымае ўзнагароду.
14 Закон мудрага — крыніца жыцьця, каб
пазьбегнуць пастак сьмерці.
15 Добры розум дае зычлівасьць, а шлях ліхадзеяў
цяжкі.
16 Кожны разумны дзейнічае з веданьнем, а дурны
выяўляе неразумнасьць.
17 Бязбожны пасланец трапляе ў бяду, а верны пасол
— аздараўленьне.
18 Галеча і ганьба таму, хто адкідае настаўленьне, а
той, хто прыймае дакараньні, будзе ў пашане.
19 Споўненае жаданьне — асалода для душы, але

адвярнуцца ад зла — агіда для дурня.
20 Хто ходзіць з мудрым, будзе мудрым, а хто сябруе з дурнем, загалосіць.
21 Ліха гоніцца за грэшнікамі, а праведным будзе аднагароджана дабром.
22 Добры пакідае спадчыну і ўнукам, а багацьце грэшнікаў захоўваецца для праведных.
23 Многа хлеба і на ніве бедных, але некаторыя гінуць, бо няма суду.
24 Хто шкадуе дубца свайго, той ненавідзіць сына свайго, а хто любіць яго, той з маленства настаўляе яго.
25 Праведнік есьць і насычае душу сваю, а нутро бязбожнікаў будзе ў нястачы.

# Разьдзел 14

1 Мудрая жонка будуе сабе дом, а неразумная руйнуе яго сваімі рукамі.
2 Хто ходзіць проста, той баіцца ГОСПАДА, а хто кры?віць шляхі свае, той грэбуе Ім.
3 У вуснах неразумнага дубец пыхлівасьці, а вусны мудрых захоўваюць іх.
4 Дзе няма скаціны, там ясьлі пустыя, але багата прыбытку ад сілы вала.
5 Сьведка праўдзівы ня схлусіць, а сьведка фальшывы дыхае няпраўдай.
6 Насьмешнік шукае мудрасьці, і яе няма, але веданьне лёгкае для разумнага.
7 Адыйдзі ад чалавека дурнога, бо ня знойдзеш вуснаў разумных.
8 Мудрасьць разумнага — разуменьне шляху свайго, а неразумнасьць дурняў — ашуканства.
9 Неразумныя сьмяюцца з віны, а пасярод правых — зычлівасьць.

10 Сэрца ведае горыч душы сваёй, і ў радасьць ягоную
ня ўвойдзе чужынец.
11 Дом бязбожнікаў будзе зьнішчаны, а намёт правых
закрасуе.
12 Ёсьць шлях, які слушны ў вачах чалавека, але канец
яго — шляхі сьмерці.
13 І ў часе сьмеху баліць сэрца, і заканчэньне радасьці
— смутак.
14 Падступны сэрцам насыціцца шляхамі сваімі, а
добры чалавек — сваімі.
15 Неразумны верыць кожнаму слову, а разумны
разважае пра крокі свае.
16 Мудры баіцца і адварочваецца ад зла, а дурны
гняўлівы і самаўпэўнены.
17 Скоры на гнеў робіць дурасьць, а чалавек зламысны
зьненавіджаны.
18 Неразумныя атрымліваюць у спадчыну дурасьць, а
разумныя ўкаранyюцца веданьнем.
19 Ліхія паклоняцца перад добрымі, а бязбожнікі —
каля брамаў праведнікаў.
20 Бедны зьненавіджаны нават бліжнім сваім, але
шмат тых, хто любіць багатага.
21 Хто цураецца бліжняга свайго, той грашыць, а хто
літуецца над бедным, той шчасьлівы.
22 Ці ж не заблукалі тыя, якія задумляюць зло? Але
міласэрнасьць і праўда будзе тым, якія задумляюць
добрае.
23 З кожнае працы будзе прыбытак, а ад пустых словаў
— толькі нястача.
24 Карона мудрых — багацьце іхняе, а вянок
дурняў — глупства іхняе.
25 Сьведка праўдзівы ратуе душы, а хлусьлівы дыхае
няпраўдай.

26 У страху перад ГОСПАДАМ моцная пэўнасьць, і для
сыноў Сваіх Ён будзе прыстанішчам.
27 Страх ГОСПАДАЎ — крыніца жыцьця, каб
пазьбегнуць пастак сьмерці.
28 У мностве народу веліч валадара, а ў malалікасьці
людзей — загуба князя.
29 У павольнага на гнеў багата розуму, а запальчывы
выяўляе дурасьць.
30 Лагоднае сэрца — жыцьцё для цела, а
зайздрасьць — парахненьне косткам.
31 Хто прыгнятае ўбогага, той зьневажае Творцу
ягонага, але шануе Яго той, хто літуецца над бедным.
32 Бязбожнік будзе адкінуты за ліхоцьце сваё, а
праведнік і пры сьмерці сваёй мае надзею.
33 У сэрцы разумнага жыве мудрасьць, і паміж дурняў
яна вядомая.
34 Праведнасьць узвышае народ, а грэх — ганьба для
народаў.
35 Зычлівы валадар да слугі разумнага, але абурэньне
ягонае на таго, хто асаромлівае яго.

# Разьдзел 15

1 Лагодны адказ адхінае ярасьць, а слова абразьлівае
выклікае гнеў.
2 Язык мудрых прыносіць веды, а вусны неразумных
выказваюць глупства.
3 Вочы ГОСПАДА на кожным месцы, яны бачаць
добрых і ліхіх.
4 Здаровы язык — дрэва жыцьця, а зласьлівы —
заламаньне духа.
5 Неразумны грэбуе настаўленьнем бацькі, а хто
зважае на дакараньні — разумнее.
6 У доме праведніка шмат багацьця, а ў набытках
бязбожніка — замяшаньне.

7 Вусны мудрых сеюць веды, а сэрца бязглуздых не
такое.
8 Ахвяра бязбожнікаў — агіда для ГОСПАДА, а
малітвы правых Яму даспадобы.
9 Агіда для ГОСПАДА — шлях бязбожніка, а таго,
хто імкнецца да праведнасьці, Ён любіць.
10 Таму, хто ўхіляецца з дарогі, — строгая кара, і
той, хто дакараньне ненавідзіць, — памрэ.
11 Адхлань і пекла перад [вачыма] ГОСПАДА, а тым
больш сэрцы сыноў чалавечых.
12 Насьмешнік ня любіць таго, хто яго дакарае, і да
мудрых ня пойдзе.
13 Радаснае сэрца робіць аблічча вясёлым, а калі сэрца
сумуе — дух разьбіты.
14 Сэрца разумнае шукае веданьня, а вусны
неразумных жывяцца дурнотаю.
15 Усе дні прыгнечанага ліхія, а ў каго добра на сэрцы,
у таго заўсёды бяседа.
16 Лепш малое ў страху ГОСПАДАВЫМ, чым вялікія
скарбы, а з імі трывога.
17 Лепш крыху гародніны з любоўю, чым тлусты вол з
нянавісьцю.
18 Чалавек гняўлівы выклікае звадкі, а няскоры да
гневу супакойвае спрэчку.
19 Шлях гультая як жываплот з церня, а сьцежка
правых — гладкая.
20 Мудры сын — радасьць для бацькі, а дурны
чалавек пагарджае маці сваёй.
21 Дурасьць — радасьць для невука, а чалавек
разумны ідзе простай дарогай.
22 Бяз рады руйнуюцца намеры, а з мноствам
дарадцаў яны зьдзяйсьняюцца.
23 Радуецца чалавек з адказу вуснаў сваіх, і якое
добрае слова адпаведнае.

24 Сьцежка жыцьця ў разважлівага [вядзе] ўгару, каб
пазьбегнуць адхлані, якая ў доле.
25 ГОСПАД развальвае дом пыхліўцаў, а мяжу ўдавы
Ён вызначае.
26 Агіда для ГОСПАДА — думкі бязбожных, а
прамовы чыстыя прыемныя [Яму].
27 Нішчыць свой дом сквапны да зыску, а хто
ненавідзіць падарункі, будзе жыць.
28 Сэрца праведніка разважае адказ, а вусны
бязбожнікаў вымаўляюць ліхоту.
29 ГОСПАД далёка ад бязбожнікаў, але малітвы
праведных Ён чуе.
30 Сьвятло вачэй радуе сэрца, і добрая вестка
ўмацоўвае косьці.
31 Вуха, якое слухае дакараньні жыцьця, будзе жыць
сярод мудрых.
32 Хто адкідае настаўленьне, грэбуе душою сваёю, а
хто слухае дакараньняў, здабывае розум.
33 Страх ГОСПАДАЎ навучае мудрасьці, і ўпакораньне
папераджае славу.

# Разьдзел 16

1 Да чалавека [належыць] меркаваньне сэрца, але ад
ГОСПАДА адказ языка.
2 Усе шляхі чалавека чыстыя ў вачах ягоных, але
ГОСПАД узважвае душы.
3 Ускладзі на ГОСПАДА ўсе справы свае, і ўсе намеры
твае зьдзейсьняцца.
4 Усё зрабіў ГОСПАД дзеля Сябе, і нават бязбожніка на
дзень ліхі.
5 Агіда для ГОСПАДА кожны пыхлівы сэрцам, можна
паручы?цца, ён не застанецца непакараным.
6 Міласэрнасьцю і праўдай адкупляецца беззаконьне,
і страх ГОСПАДАЎ адводзіць ад зла.

7 Калі ГОСПАДУ даспадобы шляхі чалавека, Ён нават
ворагаў ягоных пагодзіць з ім.
8 Лепш малое ў праведнасьці, чым багатыя прыбыткі
ў беззаконьні.
9 Сэрца чалавека абдумвае шлях свой, але ГОСПАД
накіроўвае крокі ягоныя.
10 Калі слова натхнёнае ў вуснах валадара, у судзе ня
будзе падступным язык ягоны.
11 Вага і шалі справядлівыя — ад ГОСПАДА, і ўсе
камяні ваговыя ў торбе — справа Ягоная.
12 Агіда для валадара — учынкі бязбожныя, бо
пасад умацоўваецца праведнасьцю.
13 Падабаюцца валадару вусны праведныя, і таго, хто
гаворыць праўдзіва, ён любіць.
14 Гнеў валадара — весьнік сьмерці, але мудры
чалавек улагодзіць яго.
15 У сьвятле аблічча валадара — жыцьцё, і
зычлівасьць ягоная — як воблака з позьнім
дажджом.
16 Нашмат лепш прыдбаць мудрасьць, чым золата, і
лепей прыдбаць розум, чым срэбра.
17 Шырокая дарога правых — адвярнуцца ад зла;
хто пільнуе шлях свой, той захоўвае душу сваю.
18 Перад загубай ідзе пыхлівасьць, і перад падзеньнем
— дух ганарысты.
19 Лепш скарацца духам з пакорнымі, чым дзяліць
здабычу з пыхліўцамі.
20 Разважлівы ў слове знойдзе добрае, і той, хто
спадзяецца на ГОСПАДА, — шчасьлівы.
21 Мудрага сэрцам называюць разумным, і слодыч
вуснаў павялічвае веды.
22 Розум — крыніца жыцьця для тых, хто мае яго,
але настаўленьне неразумных — глупства.

23 Сэрца мудрага робіць разважлівымі вусны ягоныя і
мове ягонай дадае ведаў.
24 Прыемныя словы — сотавы мёд, асалода для
душы і лекі для цела.
25 Ёсьць шлях, які слушны ў вачах чалавека, але канец
яго — шляхі сьмерці.
26 Работнік цяжка працуе для сябе, бо рот ягоны
прымушае яго.
27 Чалавек нягодны ліхоцьце рыхтуе, і ў вуснах
ягоных нібы агонь, які паліць.
28 Чалавек падступны сее звадкі, і пляткар разьдзяляе
сяброў.
29 Чалавек злачынны зводзіць бліжняга свайго і вядзе
яго на шлях нядобры,
30 прыплюшчвае вочы свае, каб прыдумляць подступ,
кры?віць губы свае, робячы ліха.
31 Сівізна — слаўная карона, на шляху
праведнасьці знаходзяць яе.
32 Лепш павольны на гнеў, чым магутны, і той, які
пануе над духам сваім, чым заваёўнік гораду.
33 Жэрабя кідаюць у заўлоньне, але ад ГОСПАДА ўсе
суды яго.

# Разьдзел 17

1 Лепш сухая луста ў супакоі, чым дом, поўны
заколатай жывёлы, са сваркамі.
2 Разумны слуга будзе панаваць над шалапутным
сы?нам і між братоў будзе дзяліць спадчыну.
3 Літавальны гаршчок — для срэбра, і горан — для
золата, а сэрцы выпрабоўвае ГОСПАД.
4 Ліхотнік зважае на вусны нягодныя, хлус слухае
язык згубны.

5 Хто насьміхаецца з беднага, той зьневажае Творцу
яго, і хто цешыцца з няшчасьця, не пазьбегне
пакараньня.
6 Карона старых — сыны сыноў, і слава сыноў —
бацькі іхнія.
7 Не пасуе бязглуздаму паважная мова, тым больш
шляхетнаму вусны брахлівыя.
8 Хабар — каштоўны камень у вачах гаспадара
яго, куды толькі зьвернецца ён, будзе мець посьпех.
9 Хто прыкрывае правіну, шукае любові, а хто
паўтарае слова, разьдзяляе сяброў.
10 Мацней дзейнічае нагана на разумнага, чым сто
ўдараў на дурнога.
11 Ліхадзей шукае толькі непаслухмянства, таму
бязьлітасны анёл будзе пасланы супраць яго.
12 [Лепш] спаткаць мядзьведзіцу, пазбаўленую
дзяцей, чым дурня ў яго неразумнасьці.
13 Хто адплочвае злом за дабро, у таго зло не адыйдзе
ад дому ягонага.
14 Пачатак звадкі — прарыў вады, перш, чым
спрэчка пачнецца, пакінь [яе].
15 Той, хто апраўдвае злачынцу, і той, хто вінаваціць
праведніка, — абодва агіда для ГОСПАДА.
16 Навошта грошы ў руцэ дурнога, каб набыць
мудрасьці, калі няма розуму?
17 Сябра любіць у кожны час, і ў нядолі робіцца
братам.
18 Чалавек, пазбаўлены розуму, дае руку і ручаецца
перад абліччам бліжняга свайго.
19 Хто любіць сваркі, любіць грэх, і хто падымае
высока вароты свае, шукае загубы.
20 Крывадушнае сэрца ня знойдзе дабра, і язык
здрадлівы трапіць у бяду.

21 Хто нараджае неразумнага, — на смутак сабе, і
бацька бязглуздага ня будзе цешыцца.
22 Радаснае сэрца аздараўляе, [нібы] лекі, а маркотны
дух сушыць косьці.
23 Бязбожнік бярэ хабар з-за пазухі, каб скрывіць
сьцежкі правасудзьдзя.
24 Перад абліччам разумнага — мудрасьць, а вочы
дурня — на канцы зямлі.
25 Сын неразумны — згрызота для бацькі свайго
і горыч для той, якая яго нарадзіла.
26 Таксама нядобра караць праведніка і біць
шляхетнага за шчырасьць.
27 Хто мае веданьне, той у словах ашчадны, і чалавек
разумны мае спакойны дух.
28 Таксама неразумны, калі маўчыць, лічыцца
мудрым, і калі закрывае вусны свае, разважлівым.

# Разьдзел 18

1 Свавольны шукае [свайго] жаданьня і кожнай
цьвярозай думцы праціўіцца.
2 Дурань ня хоча застанаўляцца, а толькі каб выявіць
свой розум.
3 Калі прыходзіць бязбожнік, прыходзіць пагарда, і
разам з сорамам — ганьба.
4 Словы вуснаў чалавечых — глыбокія воды,
крыніца мудрасьці — бурлівы ручай.
5 Нядобра зважаць на аблічча бязбожнага, каб
паваліць праведнага на судзе.
6 Словы дурня прыводзяць да спрэчкі, і вусны ягоныя
выклікаюць бойку.
7 Вусны дурня — ягоная загуба, а мова ягоныя —
пастка для душы яго.
8 Словы пляткара — як прысмакі, яны зыходзяць у
глыб нутра.

9 Нядбайны ў рабоце сваёй — брат нішчыцеля.
10 Імя ГОСПАДА — магутная вежа, пабяжыць туды
праведнік і будзе ў бясьпецы.
11 Маёмасьць багатага — умацаваны горад для
яго, уяўляецца яна яму як муры? высокія.
12 Перад загубай вывышаецца сэрца чалавека, а
ўпакораньне папераджае славу.
13 Хто дае адказ раней, чым выслухае, той неразумны,
і сорам яму.
14 Дух чалавека пераносіць немач сваю, але дух
маркотны хто можа ўзьняць.
15 Сэрца разважнае набывае веды, і вуха мудрых
шукае веданьня.
16 Падарунак чалавека дае яму прастору і да вялікіх
прывядзе яго.
17 Першы ў спрэчцы сваёй [падаецца] справядлівым,
але прыйдзе бліжні ягоны і выспрабуе яго.
18 Жэрабя спыняе сваркі і дзеліць між магутнымі.
19 Пакрыўджаны брат — як умацаваны горад, а
сваркі — як завалы ў замку.
20 З плоду вуснаў сваіх насыціць чалавек нутро сваё, з
прыбыткаў губаў сваіх насыціцца.
21 Сьмерць і жыцьцё ў руцэ языка; хто любіць яго,
будзе есьці плады ягоныя.
22 Хто знайшоў жонку, той знайшоў добрае і атрымаў
ласку ад ГОСПАДА.
23 Бедны гаворыць, умольваючы, а багаты адказвае
груба.
24 Чалавек, які мае сяброў, сам павінен быць
сяброўскі, і бывае, што сябар больш любіць, чым
брат.

# Разьдзел 19

1 Лепш бедны, які ходзіць у беззаганнасьці сваёй, чым
крывадушны вуснамі сваімі, і да таго ж дурны.
2 Таксама нядобра душы бяз ведаў, і хто сьпяшаецца
нагамі [сваімі], згрэшыць.
3 Неразумнасьць чалавека кры?віць шлях ягоны, але
сэрца ягонае гневаецца на ГОСПАДА.
4 Маёмасьць дадае шматлікіх сяброў, а ўбогага
пакідае бліжні ягоны.
5 Сьведка фальшывы не пазьбегне пакараньня, і хто
дыхае няпраўдай, не ўратуецца.
6 Шмат хто паніжаецца перад магнатам, і кожны —
бліжні чалавеку, які [дае] падарункі.
7 Усе браты беднага ненавідзяць яго, тым больш
сябры ягоныя аддаляюцца ад яго; той бяжыць, каб
паразмаўляць, але іх няма.
8 Хто набывае розум, той любіць душу сваю, хто шукае
разважлівасьці — знаходзіць дабро.
9 Сьведка фальшывы не пазьбегне пакараньня, і хто
дыхае няпраўдай, загіне.
10 Не пасуе дурню раскоша, тым больш слузе мець
уладу над князямі.
11 Розум чалавека стрымлівае гнеў ягоны, і слава яго
— у прабачэньні правінаў.
12 Гнеў валадара — як ры?каньне ільва, а
зычлівасьць ягоная — як раса на траве.
13 Неразумны сын — загуба для бацькі, а сварлівая
жонка — як няспыннае капаньне [праз дах].
14 Дом і маёмасьць — спадчына ад бацькоў, але
разумная жонка — ад ГОСПАДА.
15 Лянота кідае ў сон, і нядбайная душа будзе цярпець
голад.
16 Хто захоўвае прыказаньні — захоўвае душу
сваю, хто не шануе шлях Яго — памрэ.

17 Хто літуецца над убогім, той пазычае ГОСПАДУ, за
дабрадзейства Ён аднагародзіць яму.
18 Карай сына свайго, пакуль ёсьць надзея, і няхай не
спрычы?ніцца да загубы яго душа твая.
19 Зласьлівы няхай атрымае пакараньне, бо калі
пашкадуеш яго, яшчэ больш павялічыш [кару].
20 Слухай парады і прыймай настаўленьне, каб стаўся
ты мудрым пры канцы [дзён].
21 Шмат думак у сэрцы чалавека, але збудзецца намер
ГОСПАДА.
22 Пажаданая для чалавека міласэрнасьць ягоная, і
бедны лепшы за чалавека хлусьлівага.
23 Страх перад ГОСПАДАМ [вядзе] да жыцьця, і такі
[чалавек] будзе жыць, і насыціцца, і зло не наведае
яго.
24 Гультай хавае руку сваю ў місе, але нават да вуснаў
сваіх не падымае яе.
25 Бі насьмешніка, і неразумны паразумнее, дакарай
разумнага, і ён здабудзе веданьне.
26 Руйнуе бацьку, выганяе маці сын, які прыносіць
сорам і ганьбу.
27 Перастань, сыне мой, слухаць настаўленьні, якія
адводзяць ад словаў веданьня.
28 Сьведка нягодны насьміхаецца над судом, і вусны
бязбожнікаў глытаюць злачынства.
29 Падрыхтаваныя прысуды для насьмешнікаў, а
хвастаньне — на плечы дурняў.

# Разьдзел 20

1 Віно зьдзеклівае, сікера галасьлівая, і кожны, хто
блукае з імі, ня мае мудрасьці.
2 Ярасьць валадара — як рыканьне ільва, хто
выклікае яе, грашыць супраць душы сваёй.

3 Слава для чалавека — пакінуць спрэчку, а ўсе
неразумныя задзірлівыя.
4 Дзеля холаду гультай ня хоча араць, таму будзе
прасіць у час жніва, і [не атрымае] нічога.
5 Намеры ў сэрцы чалавека — глыбокія воды, але
разумны чалавек вычэрпвае іх.
6 Багата людзей абвяшчае пра міласэрнасьць сваю,
але праўдамоўнага чалавека хто можа знайсьці?
7 Праведнік ходзіць у беззаганнасьці сваёй,
шчасьлівыя сыны ягоныя пасьля яго.
8 Валадар, які сядзіць на судовым пасадзе,
расьцярушвае вачыма сваімі ўсякую ліхоту.
9 Хто можа сказаць: «Я ачысьціў сэрца маё, я чысты
ад грэху майго»?
10 Неаднолькавыя вагі і неаднолькавая эфа, адно і
другое — агіда для ГОСПАДА.
11 Нават у юнака па паводзінах можна зразумець, ці
чыстыя, ці правыя справы ягоныя.
12 Вуха, якое чуе, і вока, якое бачыць, — ГОСПАД
зрабіў і адно, і другое.
13 Не любі спаць, каб табе не зьбяднець, адкрый вочы
свае, і насыцішся хлебам.
14 «Дрэннае, дрэннае», — кажа пакупнік, а калі
адыдзецца, тады хваліцца.
15 Ёсьць золата і мноства пэрлінаў, але
найкаштоўнейшая рэч — вусны разумныя.
16 Забяры адзеньне яго, бо ён паручы?ўся за чужога, і
за чужынца вазьмі заклад ад яго.
17 Салодкі чалавеку хлеб ашуканства, але потым
пяском напоўняцца вусны ягоныя.
18 Думкі ўмацоўваюцца парадамі, і з разважлівасьцю
вядзі вайну.
19 Хто ходзіць абмоўнікам, той выяўляе таямніцы,
дык ня зьвязвайся з тым, хто рот свой разьзяўляе.

20 Хто кляне бацьку свайго і маці сваю, у таго сьветач
патухне сярод глыбокай цемры.
21 Спадчына, спачатку пасьпешліва здабытая, ня
будзе пры канцы дабраслаўлёная.
22 Не кажы: «Я адплачу за зло», спадзявайся на
ГОСПАДА, і Ён вы?бавіць цябе.
23 Агіда для ГОСПАДА — неаднолькавыя вагі, і
шалі падманлівыя — ня добра.
24 Ад ГОСПАДА крокі чалавека, і як жа чалавеку
зразумець шлях свой?
25 Пастка для чалавека — пасьпешліва зрабіць
шлюбаваньне, а пасьля абяцаньня разважаць.
26 Мудры валадар расьцярушыць бязбожнікаў і
зьверне на іх кола [малатарнае].
27 Сьветач ГОСПАДАЎ — дух чалавечы, ён
дасьледуе ўсе сховы нутра.
28 Міласэрнасьць і праўда ахоўваюць валадара, і
міласэрнасьцю ўмацоўваецца пасад ягоны.
29 Слава юнакоў — сіла іхняя, а веліч старых —
сівізна.
30 Вы?тні і раны — лекавальная масьць ад
ліхоты, і ўдары ў глыбіню нутра.

# Разьдзел 21

1 Сэрца валадара ў руцэ ГОСПАДА, як ручаі водаў, Ён
скіроўвае яго, куды хоча.
2 Усе шляхі чалавека слушныя ў вачах ягоных, але
ГОСПАД узважвае сэрцы.
3 Праведнасьць і суд даспадобы ГОСПАДУ больш, чым
ахвяра.
4 Узьнесеныя вочы і надзьмутае сэрца — баразна
бязбожных, [і гэта] грэх.

5 Думкі руплівага [прыносяць] прыбытак, а кожнага
нецярплівага — нястачу.
6 Зьбіраньне скарбаў языком падманлівым — пара,
што зьнікае, шуканьне сьмерці.
7 Злачыннасьць бязбожнікаў зьвернецца на іх, бо яны
грэбуюць чыніць суд [справядлівы].
8 Крывы шлях чалавека нягоднага, а справы чыстага
— простыя.
9 Лепей жыць у куце на даху, чым са сварліваю
жонкаю ў прасторным доме.
10 Душа бязбожніка жадае зла, ня знойдзе [ласкі] ў
вачах ягоных бліжні яго.
11 Калі караюць насьмешніка, неразумны стаецца
мудрэйшым, і калі мудрага вучаць, ён здабывае
веданьне.
12 Разважае праведнік пра дом бязбожніка, як гінуць
бязбожнікі ў ліхоцьці сваім.
13 Хто вушы свае затыкае на крык убогага, той сам
будзе клікаць, але ня будзе адказу.
14 Падарунак таемны тушыць гнеў, а гасьцінец у
заўлоньне — вялікую ярасьць.
15 Правасудзьдзе — радасьць для праведніка і
загуба для злачынцаў.
16 Чалавек, што зьбіваецца са шляху розуму,
супачы?не ў грамадзе памёршых.
17 Хто любіць весяліцца, будзе ў нястачы, а хто любіць
віно і алей, ня будзе багатым.
18 Вы?купам за праведніка [будзе] бязбожнік, а за
правага — ліхадзей.
19 Лепш жыць у зямлі пустыннай, чым з жонкай
гняўлівай і сварлівай.
20 Прывабныя скарбы і алей у жытле мудрага, а
бязглузды чалавек змарнуе іх.

21 Хто імкнецца да праведнасьці і міласэрнасьці,
знойдзе жыцьцё, праведнасьць і славу.
22 Мудры ўвойдзе ў горад магутных і зрыне моц, у
якой яны мелі пэўнасьць.
23 Хто захоўвае вусны свае і язык свой, захоўвае душу
сваю ад бедаў.
24 Пыхлівы і дзёрзкі, называны блюзьнерам, робіць
усё ў шале нахабства.
25 Жаданьне гультая заб’е яго, бо рукі ягоныя
адмаўляюцца працаваць.
26 Кожны дзень ён жадае і прагне, а праведнік дае і не
шкадуе.
27 Ахвяра бязбожнікаў — брыдота, тым больш тыя,
якія складаюць яе з падступнасьцю.
28 Сьведка хлусьлівы згіне, а чалавек, які слухае, будзе
гаварыць заўсёды.
29 Чалавек бязбожны ўпарты абліччам сваім, а правы
разумее шлях свой.
30 Няма мудрасьці, і няма розуму, і няма рады
насуперак ГОСПАДУ.
31 Каня рыхтуюць на дзень бітвы, але перамога — ад
ГОСПАДА.

# Разьдзел 22

1 Лепш [добрае] імя, чым вялікія багацьці, лепш
добрая слава, чым срэбра і золата.
2 Багаты і бедны сустракаюцца, Творца іх усіх —
ГОСПАД.
3 Разумны бачыць зло і хаваецца, а неразумныя ідуць
і будуць пакараныя.
4 [Нагарода] за пакору і страх перад ГОСПАДАМ —
багацьце, і слава, і жыцьцё.
5 Церні і пасткі на шляху крывадушнага, а хто
захоўвае душу сваю, той аддаляецца ад іх.

6 Пастаў юнака на слушны шлях, і ён ня збочыць з яго,
нават калі састарэе.
7 Багаты пануе над бедным, і чалавек, які ўзяў пазыку,
— слуга паверніка.
8 Хто сее беззаконьне, той будзе жаць ліха, і кій гневу
ягонага будзе зьнішчаны.
9 Хто мае добрае вока, той будзе дабраслаўлёны, бо з
хлеба свайго дае ўбогаму.
10 Выгані насьмешніка, і адыйдзе звадка, і суцішацца
спрэчкі і абразы.
11 Хто любіць чыстасьць сэрца, у таго ласка на вуснах
яго, і валадар з ім сябруе.
12 Вочы ГОСПАДА захоўваюць веданьне, Ён касуе
словы ліхадзея.
13 Гультай кажа: «Леў на двары, пасярод плошчы буду
забіты».
14 Вусны чужаніцы — глыбокая яма, на каго
загневаўся ГОСПАД, той уваліцца туды.
15 Дурасьць прывязаная да сэрца юнака, але дубец
настаўленьня выганіць яе.
16 Хто ўціскае ўбогага, каб памножыць сваё, і дае
багатаму, той згалее.
17 Прыхілі вуха тваё, і слухай словы мудрых, і сэрца
тваё зьвярні да ведаў маіх,
18 бо цудоўна будзе, калі захаваеш іх у нутры тваім, і
будуць яны таксама на вуснах тваіх,
19 каб пэўнасьць твая была ў ГОСПАДЗЕ, я вучу цябе
сёньня.
20 Ці ж не пісаў я табе тройчы парады і навучаньні,
21 каб паведаміць табе дакладныя словы праўды, каб
ты мог перадаць словы праўды тым, што паслалі
цябе?
22 Не абдзірай убогага, таму што ён убогі, і не ўціскай
прыгнечанага каля брамы,

23 бо ГОСПАД будзе бараніць у справе іхняй і адбярэ
душу ў тых, што іх абіраюць.
24 Не сябруй з васпанам гняўлівым і з чалавекам
нястрыманым не хадзі,
25 каб ты не навучыўся сьцежкам яго і не нацягнуў
пятлі на душу тваю.
26 Ня будзь з тых, што даюць руку, што заручаюцца за
даўгі.
27 Калі ня маеш, чым заплаціць, навошта маюць
забраць з-пад цябе ложак твой?
28 Не перасоўвай мяжы старадаўняй, якую вызначылі
бацькі твае.
29 Ці бачыў ты чалавека, спраўнага ў занятку сваім?
Перад абліччам валадароў ён будзе стаяць, ня будзе
ён стаяць перад прасьцякамі.

# Разьдзел 23

1 Калі сядзеш есьці з вялікім панам, пільна зважай,
што перад табою,
2 і прыстаў нож да горла твайго, калі прагавітая душа
твая.
3 Ня квапся на прысмакі ягоныя, бо гэта падманлівы
хлеб.
4 Не намагайся мець багацьце, пакінь разважаньні
свае.
5 Зьвернеш вочы твае на яго, а яго няма, бо справіць
яно крылы сабе і паляціць, як арол, аж у неба.
6 Ня еш хлеб з зайздросным і ня квапся на яго
прысмакі,
7 бо якія думкі ў сэрцы ягоным, такі і ён. «Еш і пі», —
кажа ён табе, але сэрца яго не з табою.
8 Кавалак, які ты зьеў, званітуеш, дарэмныя будуць
салодкія словы твае.
9 Не гавары ў вушы дурня, бо ён узгардзіць разумнымі
мовамі тваімі.

10 Не перасоўвай мяжы старадаўняй і на поле сіротаў
не ўваходзь,
11 бо дужы Абаронца іхні, і Ён будзе бараніць іх у
справе іхняй з табою.
12 Зьвярні сэрца таваё да настаўленьня, і вушы твае —
да словаў веданьня.
13 Не пакідай юнака без настаўленьня, бо калі
пакараеш яго дубцом, ён не памрэ.
14 Ты пакараеш яго дубцом і выратуеш душу ягоную
ад пекла.
15 Сыне мой, калі мудрым будзе сэрца тваё, будзе
радавацца з табою і маё сэрца.
16 І будуць цешыцца ныркі мае, калі на вуснах тваіх
будуць словы правасьці.
17 Няхай сэрца тваё не зайздросьціць грэшнікам, але
кожны дзень няхай будзе яно ў страху ГОСПАДАВЫМ,
18 бо ёсьць будучыня, і надзея твая не загіне.
19 Слухай, сыне мой, і будзь мудры, і скіроўвай сэрца
тваё на шлях [просты].
20 Ня будзь сярод тых, што напіваюцца віна, сярод
тых, што аб’ядаюцца мясам,
21 бо п’яніца і абжора зьбяднеюць, і заспанасьць
апране ў лахманы.
22 Слухай бацьку твайго, які нарадзіў цябе, і не
цурайся маці тваёй, калі яна састарэе.
23 Купляй праўду і не прадавай мудрасьці,
настаўленьня і розуму.
24 Цешыцца і весяліцца бацька праведнага, і той, хто
нарадзіў мудрага, радуецца з яго.
25 Няхай радуецца бацька твой, і тая, што нарадзіла
цябе, няхай весяліцца.
26 Сыне мой, дай мне сэрца тваё, і няхай вачам тваім
будуць даспадобы шляхі мае.

27 Бо распусьніца — яма глыбокая, і чужая [жонка]
— цесны калодзеж.
28 Яна цікуе, быццам забойца, і памнажае ліхадзеяў
паміж людзьмі.
29 У каго стогн? У каго гора? У каго сваркі? У каго
смутак? У каго раны без прычыны? У каго чырвоныя
вочы?
30 У тых, якія доўга сядзяць пры віне, у тых, якія
прыходзяць спрабаваць віна мяшанага.
31 Не глядзі на віно, як яно чырванее, як прамяніцца ў
келіху, як роўненька ліецца,
32 у рэшце яно ўкусіць, як зьмяя, і ўджаліць, як
гадзіна.
33 Вочы твае будуць глядзець на чужых [жонак], і
сэрца тваё загаворыць падступна.
34 І будзеш ты як той, што ляжыць пасярод мора, і як
той, што ляжыць на версе мачты.
35 [І скажаш:] «Білі мяне, а я не адчуваў, штурхалі
мяне, а я ня ведаў. Калі прачнуся, зноў буду шукаць
таго самага».

# Разьдзел 24

1 Не зайздросьці людзям ліхім, не жадай быць з імі,
2 бо пра злачыннасьць думае сэрца іхняе, і пра ліхоту
вусны іхнія гавораць.
3 Мудрсьцю будуецца дом, і розумам умацоўваецца,
4 і праз веданьне напаўняюцца пакоі яго ўсялякай
каштоўнай і прывабнай маёмасьцю.
5 Мудры чалавек мае моц, і чалавек, які мае веды,
умацоўвае сілу [сваю].
6 Таму з разважлівасьцю вядзі вайну тваю, і пры
мностве дарадцаў — выратаваньне.
7 Занадта высокая мудрасьць для неразумнага, ён не
раскрывае ў брамах вуснаў сваіх.

8 Хто задумляе рабіць ліхое, таго называюць
зламысным.
9 Намеры бязглуздага — грэх, і [намеры] блюзьнера
— агіда для чалавека.
10 Калі ты слабы ў дзень бедства, дык малая сіла твая.
11 Ратуй узятых на сьмерць, і ці ж не пашкадуеш тых,
якія сказаныя на загубу?
12 Калі скажаш: «Вось, мы ня ведалі гэтага?», ці ж
Той, Хто дасьледуе сэрцы, не разумее? Ці ж Той, Хто
захоўвае душу тваю, ня ведае? Ці ж Ён не аддасьць
чалавеку паводле справаў ягоных?
13 Еш мёд, сыне мой, бо ён добры, і соты салодкія для
паднябеньня твайго.
14 Гэтак сама веданьне мудрасьці для душы тваёй.
Калі ты знайшоў яе, ёсьць будучыня, і надзея твая не
загіне.
15 Не цікуй, бязбожніку, каля жытла праведніка, не
спусташай месца супачынку ягонага,
16 бо сем разоў упадзе праведнік і ўстане, а бязбожнікі
трапяць у няшчасьце.
17 Ня радуйся, калі ўпадзе вораг твой, і няхай ня
цешыцца сэрца тваё, калі ён спатыкнецца,
18 бо часам убачыць ГОСПАД, і будзе [гэта] ліхім у
вачах Ягоных, і Ён адверне гнеў Свой ад яго.
19 Не абурайся на ліхотнікаў і не зайздросьці
бязбожнікам,
20 бо ня будзе будучыні ліхому, і сьветач бязбожнікаў
стухне.
21 Бойся ГОСПАДА, сыне мой, і валадара, і ня
зьвязвайся са змоўшчыкамі,
22 бо неспадзявана прыйдзе на іх загуба, і бедства ад
іх абодвух хто можа ведаць.
23 Гэта таксама для мудрых: нядобра зважаць на
аблічча ў судзе.

24 Таго, хто кажа бязбожніку: «Ты праведны», будуць
праклінаць народы і будуць брыдзіцца ім людзі.
25 А тымі, што дакараюць, будуць захапляцца, і зыйдзе
на іх шчодрае дабраславенства.
26 У вусны цалуе той, хто адказвае шчырымі словамі.
27 Выканай працу тваю вонках [дому] і скончы яе на
полі тваім, а пасьля пабудуй дом твой.
28 Ня сьведчы без прычыны супраць бліжняга твайго,
і не падманвай вуснамі тваімі.
29 Не кажы: "Як ён мне зрабіў, так і я зраблю яму,
аддам чалавеку паводле справаў яго".
30 Праходзіў я праз поле гультая і праз вінаграднік
чалавека бяз розуму,
31 і вось, усё зарасло асотам, і крапіва пакрыла
паверхню яго, і каменная агароджа зруйнаваная.
32 І паглядзеў я, і зьвярнуў [на гэта] сэрца маё, убачыў,
і атрымаў настаўленьне:
33 «Крыху пасьпіш, крыху падрэміш, крыху, склаўшы
рукі, паляжыш.
34 і прыйдзе, як валацуга, беднасьць твая, і нястача
твая — як чалавек узброены».

# Разьдзел 25

1 Гэта таксама прыповесьці Салямона, сабраныя
людзьмі Эзэкіі, валадара Юды.
2 Слава Божая — утоіць справу, а слава валадароў
— дасьледаваць справу.
3 Высокасьць неба, глыбокасьць зямлі і сэрца
валадароў недасьледныя.
4 Аддзялі жужаль ад срэбра, і выйдзе ў майстра
начыньне.
5 Прыбяры бязбожніка ад аблічча валадара, і пасад
ягоны ўмацуецца праведнасьцю.

6 Не ўзьвялічвай сябе перад абліччам валадара і на
месцы вялікіх ня стой,
7 бо лепш, калі скажуць табе: “Узьніміся вышэй”,
чым калі панізяць цябе перад абліччам магната, якога
бачылі вочы твае.
8 Не кідайся пасьпешліва судзіцца, бо што зробіш у
канцы, калі асароміць цябе бліжні твой.
9 Вядзі спрэчку з бліжнім тваім і не выяўляй таямніцу
іншага,
10 каб той, хто пачуе, не ўпікнуў цябе, і каб не
зьвярнулася [супраць] цябе гаворка твая.
11 Як залатыя яблыкі са срэбнымі ўпрыгожваньнямі,
так слова, сказанае дарэчы.
12 Як залатыя завушніцы і аздоба са шчырага золата,
так мудрае дакараньне для ўважлівага вуха.
13 Як прахалода сьнегу ў дзень жніва, так верны
пасланец для таго, хто паслаў яго, ён ажыўляе душу
гаспадара свайго.
14 Як хмары і вецер без дажджу, так чалавек, які
хваліцца падарункам фальшывым.
15 Цярплівасьцю пераканаеш начальніка, і лагодны
язык ломіць костку.
16 [Як] знайшоў мёд, еш, колькі трэба табе, каб ты не
пераеў і не званітаваў.
17 Стрымай нагу тваю ад дому бліжняга твайго, каб ты
не надакучыў яму і каб ён не ўзьненавідзеў цябе.
18 Як мачуга, меч і вострая страла, так чалавек,
які кажа фальшывае сьведчаньне супраць бліжняга
свайго.
19 Як гнілы зуб і кульгавая нага, так надзея на ліхадзея
ў дзень бедства.
20 Як здымаць адзеньне ў халодны дзень, як [ліць]
воцат на салетру, так сьпяваць песьні засмучанаму
сэрцу.

21 Калі ненавісьнік твой галодны, накармі яго хлебам,
калі смагне, напаі яго вадою,
22 бо гэтым вугольле зьбіраеш на галаву ягоную, і
ГОСПАД аднагародзіць табе.
23 Паўночны вецер прыганяе дождж, а язык абмоўніка
— гнеў на тварах.
24 Лепей жыць у куце на даху, чым са сварліваю
жонкаю ў прасторным доме.
25 Як халодная вада для стомленай душы, так добрыя
весткі з далёкага краю.
26 Як скаламучанае жарало і зьнішчаная крыніца, так
праведнік, які падае перад бязбожнікам.
27 Як нядобра есьці шмат мёду, так дамагацца сваёй
славы ня ёсьць слава.
28 Як горад зруйнаваны і без муроў, так чалавек, які
не валодае духам сваім.

# Разьдзел 26

1 Як сьнег улетку, а дождж у жніво, так дурню не пасуе
слава.
2 Як птушка пераляціць і як ластаўка паляціць, так
праклён беспрычынны ня збудзецца.
3 Пуга — для каня, аброць — для асла, а кій — на
сьпіну дурня.
4 Не адказвай дурню паводле дурасьці ягонай, каб ня
стаўся ты падобным да яго.
5 Адказвай дурню паводле дурасьці ягонай, каб ня
стаўся ён мудрым у вачах сваіх.
6 Падцінае сабе ногі і п’е сваю шкоду той, хто праз
рукі дурня слова пасылае.
7 Няроўныя ногі кульгавага, таксама пры?казка ў
вуснах дурня.
8 Як прывязваць камень да вяроўкі, так аддаваць
пашану дурню.

9 Як калючка ў руцэ п’янага, так прыказка ў вуснах
дурня.
10 Вяльможны робіць усё: і дурня наймае, і мінака
наймае.
11 Як сабака вяртаецца да ванітаў сваіх, так дурань
паўтарае дурасьць сваю.
12 Ці бачыў ты чалавека, мудрага ў вачах сваіх? На
дурня большая надзея, чым на такога.
13 Гультай кажа: «Леў на шляху! Леў на плошчы!»
14 Дзьверы варочаюцца на завесах сваіх, а гультай —
на ложку сваім.
15 Гультай хавае руку сваю ў місе, і яму цяжка падняць
яе да вуснаў сваіх.
16 Гультай мудрэйшы ў сваіх вачах за сямёх, што
адказваюць з разуменьнем.
17 Хапае сабаку за вушы той, хто мяшаецца ў чужую
спрэчку.
18 Як вар’ят, які кідае агонь, стрэлы і сьмерць,
19 так чалавек, які падманвае бліжняга свайго і кажа:
«Гэта я жартую».
20 Калі няма дроваў, агонь гасьне, калі няма пляткара,
звадка сьціхае.
21 Вугаль — для жару, дровы — для агню, а чалавек
сварлівы — для распальваньня спрэчкі.
22 Словы пляткара — як прысмакі, яны зыходзяць у
глыб нутра.
23 Як гліна, паліваная срэбрам з жужалем, так
гарачыя вусны і ліхое сэрца.
24 Ненавісьнік прыкрываецца вуснамі сваімі, а ў
нутры сваім рыхтуе ашуканства.
25 Калі ён робіць лагодным голас свой, ня вер яму, бо
сем брыдотаў у сэрцы ягоным.
26 [Чыя] нянавісьць прыхоўваецца ашуканствам, таго
ліхота выявіцца перад грамадою.

27 Хто капае яму, той уваліцца ў яе, і хто пакоціць
камень, на таго ён вернецца.
28 Брахлівы язык ненавідзіць пакрыўджаных ім, і
вусны ліслівыя вядуць да загубы.

# Разьдзел 27

1 Не хваліся заўтрашнім днём, бо ня ведаеш, што гэты
дзень народзіць.
2 Няхай іншы хваліць цябе, а ня вусны твае, нехта
чужы, а ня губы твае.
3 Камень цяжкі і пясок важкі, але гнеў неразумнага
цяжэйшы за іх абодвух.
4 Нястрымны гнеў і бязьлітасная ярасьць, але хто
ўстаіць перад зайздрасьцю?
5 Лепш адкрытае дакараньне, чым схаваная любоў.
6 Раны ад таго, хто любіць, [выказваюць] вернасьць,
але шматлікія пацалункі ненавісьніка.
7 Душа насычаная топчацца па мёдзе, а душы
галоднай усё горкае салодкае.
8 Як птушка, што пакінула гняздо сваё, так чалавек,
які пакідае месца сваё.
9 Алей і кадзіла радуюць сэрца, а салодкасьць
бліжняга — у парадзе ад душы.
10 Не пакідай бліжняга твайго і бліжняга бацькі
твайго, і ў дом брата твайго не хадзі ў дзень
няшчасьця твайго, бо лепш сусед блізка, чым брат
далёка.
11 Будзь мудры, сыне мой, і ўзрадуй сэрца маё, каб
мог я адказаць таму, хто зьневажае мяне.
12 Разумны бачыць зло і хаваецца, а неразумныя ідуць
і будуць пакараныя.
13 Забяры адзеньне яго, бо ён паручы?ўся за чужога, і
за чужынца вазьмі заклад ад яго.

14 Таму, хто рана раніцаю гучным голасам
дабраслаўляе бліжняга свайго, палічаць гэта за
праклён.
15 Няспынная капаньне [праз дах] у дажджлівы дзень
і сварлівая жонка — аднолькавыя.
16 Хто [спрабуе] схаваць яе, хавае вецер і пахкі алей у
правай руцэ сваёй, які выдае сябе.
17 Жалеза жалезам вострыцца, а чалавек вострыць
аблічча бліжняга свайго.
18 Хто даглядае дрэва фігавае, будзе есьці плады яго,
а хто пільнуецца гаспадара свайго, будзе ў пашане.
19 Як у вадзе аблічча да аблічча, так сэрца чалавека —
да чалавека.
20 Адхлань і пекла ненасытныя, і вочы чалавека
ненасытныя.
21 Літавальны гаршчок для срэбра і горан для золата,
а для чалавека — вусны, якія хваляць яго.
22 Хоць будзеш таўчы неразумнага таўкачом паміж
зерня ў ступе, дурнота ягоная не адыйдзе ад яго.
23 Ведай добра авечак тваіх, зьвяртай сваё сэрца да
статкаў тваіх,
24 бо багацьце ня вечнае, і ці ж дыядэма [перадаецца]
з пакаленьня ў пакаленьне?
25 Вырастае трава, і зьяўляецца зеляніна, і зьбіраюць
сена з гораў.
26 Ягняты — на вопратку табе, і казлы — плата за
поле.
27 І досыць казінага малака на ежу табе, і на ежу дому
твайму, і на жыцьцё для служак тваіх.

# Разьдзел 28

1 Бязбожнік бяжыць, хоць ніхто не перасьледуе яго, а
праведнікі ўпэўненыя, як ільвы.
2 Дзеля правінаў зямлі шмат у ёй начальнікаў, а праз
чалавека, які ведае і разважае, яна даўгавечная.

3 Чалавек бедны, які ўціскае ўбогіх, як залеўны дождж, [што пакідае] бяз хлеба.
4 Хто адступаецца ад закону, той хваліць бязбожніка, а хто захоўвае закон, паўстае супраць яго.
5 Ліхія людзі не разумеюць суду, а тыя, што шукаюць ГОСПАДА, разумеюць усё.
6 Лепш бедны, які ходзіць у беззаганнасьці сваёй, чым той, які кры?віць шляхі свае, дарма што багаты.
7 Сын разумны захоўвае закон, а той, хто сябруе з абжорамі, сароміць бацьку свайго.
8 Хто памнажае маёмасьць сваю квотай і ліхвай, той зьбірае яе для таго, хто літуецца над убогім.
9 Хто адварочвае вуха сваё, каб ня чуць закону, таго малітва — брыдота.
10 Хто схіляе правых на шлях зла, сам уваліцца ў яму сваю, а беззаганныя атрымаюць у спадчыну добрае.
11 Мудры ў вачах сваіх чалавек багаты, але ўбогі, які мае розум, выспрабуе яго.
12 Калі праведнікі перамагаюць — вялікая слава, а калі ўздымаюцца бязбожнікі, чалавек хаваецца.
13 Той, хто хавае свае правіны, ня будзе мець посьпеху, а хто прызнаецца і пакідае іх, дазнае міласэрнасьці.
14 Шчасьлівы чалавек, які мае трымценьне заўсёды, а хто робіць цьвёрдым сэрца сваё, трапіць у бяду.
15 Леў рыклівы і мядзьведзь бадзяжны — бязбожны пан над бедным народам.
16 Правадыр, пазбаўлены розуму, робіць шмат крыўды, а хто ненавідзіць хцівасьць, прадоўжыць дні свае.
17 Чалавек, абцяжараны крывёю душы [другога], будзе бегаць да магілы, і ніхто не падтрымае яго.
18 Хто ходзіць беззаганна, будзе ўратаваны, а

крывадушны на шляхах [сваіх] упадзе на адным [з іх].
19 Хто абрабляе сваю зямлю, насыціцца хлебам, а хто
гоніцца за марнасьцю, насыціцца беднасьцю.
20 Чалавек верны багаты ў дабраславенстве, а хто
сьпяшаецца ўзбагацець, не міне пакараньня.
21 Нядобра зважаць на аблічча, бо дзеля кавалку хлеба
чалавек робіць беззаконьне.
22 Сьпяшаецца да багацьця чалавек ліхога вока і ня
ведае, што нястача прыйдзе на яго.
23 Той, хто дакарае чалавека, знойдзе пасьля
[большую] ласку, чым той, хто языком лісьлівіць.
24 Хто абкрадае бацьку свайго і маці сваю і кажа:
«Няма тут віны», той супольнік нішчыцелю.
25 Душа надзьмутая ўзьнімае звадку, а хто спадзяецца
на ГОСПАДА, будзе насычаны.
26 Хто спадзяецца на сэрца сваё, той дурань, а хто
ходзіць у мудрасьці, будзе збаўлены.
27 Хто дае бедным, ня будзе мець нястачы, а хто хавае
вочы свае, мецьме шмат праклёнаў.
28 Калі бязбожнікі ўздымаюцца, людзі хаваюцца, а
калі яны гінуць, памнажаюцца праведнікі.

# Разьдзел 29

1 Чалавек, які на дакараньне робіць цьвёрдым
карак свой, раптоўна будзе зьнішчаны, і ня будзе
аздараўленьня.
2 Калі памнажаюцца праведнікі, радуецца народ, а
калі пануе бязбожнік, народ стогне.
3 Чалавек, які любіць мудрасьць, радуе бацьку
свайго, а той, які сябруе з распусьніцамі, распускае
маёмасьць.

4 Валадар правасудзьдзем умацоўвае зямлю, а
чалавек, які [любіць] дары, руйнуе яе.
5 Чалавек, які лісьлівіць бліжняму свайму, стаўляе
сетку нагам ягоным.
6 У злачынстве ліхога чалавека пастка [для яго], а
праведнік сьпявае і радуецца.
7 Праведнік ведае справу ўбогіх, а бязбожнік і ня
думае ведаць [яе].
8 Блюзьнеры ўзбураюць горад, а мудрыя
ўтаймоўваюць гнеў.
9 Мудры чалавек, судзячыся з неразумным, і злуецца,
і сьмяецца, і ня мае спакою.
10 Людзі крывавыя ненавідзяць беззаганнага, а
правыя дбаюць пра душу ягоную.
11 Дурань выяўляе ўвесь свой дух, а мудры
затрымлівае яго на пазьней.
12 Калі пан зважае на словы фальшывыя, тады
бязбожныя ўсе, што служаць яму.
13 Бядак і прыгнятальнік сустракаюцца, сьвятло
вачам іх абодвух дае ГОСПАД.
14 Валадар, які судзіць убогіх паводле праўды, умацуе
свой пасад на вякі.
15 Дубец і дакор даюць мудрасьць, а дзіцё, пакінутае
[само сабе], — сорам для маці яго.
16 Калі памнажаюцца бязбожнікі, памнажаюцца
злачынствы, але праведнікі ўбачаць падзеньне іх.
17 Карай сына твайго, і ён дасьць табе супачыць, і
дасьць асалоду для душы тваёй.
18 Без [прароцкага] відзежу народ неакелзаны, а хто
захоўвае закон, той шчасьлівы.
19 Словамі ня будзе настаўлены слуга, бо хоць
зразумее, але ня дасьць адказу.
20 Ці бачыў ты чалавека, хуткага на словы? На дурня
большая надзея, чым на такога.

21 Калі з маленства песьціць слугу свайго, урэшце, той
станецца гаспадаром.
22 Гняўлівы чалавек усчынае звадку, а разʼюшаны
[ўчыняе] багата правінаў.
23 Пыха чалавека прыніжае яго, а пакорлівы духам
здабудзе славу.
24 Хто супольнічае са злодзеем, ненавідзіць душу
сваю, ён чуе праклёны, але не выяўляе [гэтага].
25 Страх перад чалавекам стаўляе пастку, а хто
спадзяецца на ГОСПАДА, будзе ў бясьпецы.
26 Шмат хто шукае аблічча пана, але ГОСПАД судзіць
чалавека.
27 Агіда для праведнікаў — чалавек беззаконны,
а для бязбожніка агідны той, што [ідзе] простым
шляхам.

# Разьдзел 30

1 Словы Агура, сына Якэ, выслоўі, якія сказаў чалавек
гэты да Ітыэля, да Ітыэля і Укаля:
2 Бо я найдурнейшы між людзей, і розуму чалавечага
няма ў мяне,
3 не навучыўся я мудрасьці і ведаў сьвятых ня ведаю.
4 Хто ўзыходзіў на неба і зыходзіў? Хто сабраў вецер
у жменю сваю? Хто зьвязаў воды ў адзежу? Хто
ўмацаваў усе канцы зямлі? Якое імя яго і якое імя
сына ягонага, ці ведаеш ты?
5 Усе словы Бога чыстыя [ад дамешкаў], Ён — шчыт
для тых, што маюць у Ім надзею.
6 Не дадавай да словаў Ягоных, каб Ён ня выкрыў цябе
і ня стаўся ты падманшчыкам.
7 Дзьве рэчы прашу ў Цябе, не адмаўляй мне перш,
чым памру:

8 Марнасьць і слова хлусьлівае аддалі ад мяне, ані
беднасьці, ані багацьця не давай мне, сыць мяне
хлебам, вызначаным для мяне,
9 каб я, насыціўшыся, ня выракся Цябе і не сказаў:
«Хто ГОСПАД?», або каб, зьбяднеўшы, ня стаў красьці
і ганьбіць імя Бога майго.
10 Не ачарняй слугі перад гаспадаром ягоным, каб ён
не пракляў цябе і ты ня стаўся вінаватым.
11 [Ёсьць] пакаленьне, якое праклінае бацьку свайго і
не дабраслаўляе маці сваю,
12 пакаленьне, якое чыстае ў вачах сваіх, але не
абмытае ад бруду свайго,
13 пакаленьне, у якога пыхлівыя вочы і павекі
ўзьнятыя,
14 пакаленьне, у якога зубы — мячы, а сківіцы —
нажы, каб есьці ўцісьнёных на зямлі і гаротных між
людзей.
15 У п’яўкі дзьве дачкі: «давай» і «давай». Вось тры
ненасытныя і чатыры, якія ня скажуць: «Досыць»:
16 адхлань і чэрава няплоднае, зямля, якая не
насычаецца вадою, і агонь, які ня кажа: «Досыць».
17 Вока, якое зьдзекуецца з бацькі і пагарджае
паслухмянасьцю маці, выдзяўбаюць груганы над
ракою і зьядуць арляняты.
18 Вось тры [рэчы], дзіўныя для мяне, і чатырох не
разумею:
19 шляху арла ў небе, шляху зьмяі на скале, шляху
карабля сярод мора і шляху мужчыны да дзяўчыны.
20 Такі самы шлях жанчыны чужаложнай: зьела,
абцёрла вусны свае і кажа: «Я не зрабіла благога».
21 Дзеля трох трасецца зямля, і чатырох яна зьнесьці
ня можа:
22 слугі, калі ён валадарыць, бязглуздага, калі ён
насычаецца хлебам,

23 ганебнай жанчыны, калі яна замуж выходзіць, і
нявольніцы, калі яна спадкуе па гаспадыні сваёй.
24 Вось чатыры малыя на зямлі, але яны мудрэйшыя
за мудрых:
25 мурашкі — народ ня моцны, але летам
назапашваюць хлеб свой,
26 горныя мышы — народ не магутны, але
стаўляюць дамы свае на скале,
27 няма валадара ў саранчы, але ўсе выходзяць
шыхтавана,
28 павук лапкамі чапляецца, але вось, ён у палацы
валадара.
29 Вось трое крочаць паважна, і чацьвёра паважна
ходзяць:
30 леў, магутнейшы між зьвярамі, ні перад кім не
саступае,
31 конь асядланы, і казёл, і валадар, супраць якога
ніхто не паўстане.
32 Калі вывышаешся бяздумна або калі задумаў ліхое,
[палажы] руку сваю на вусны.
33 Бо хто зьбівае малако, атрымае масла, і хто ўдарыць
у нос, атрымае кроў, а хто выклікае гнеў, атрымае
сварку.

# Разьдзел 31

1 Словы Лемуэля, валадара, выслоўі, якім навучыла
яго маці ягоная.
2 Што, сыне мой? Што, сыне жывата майго? Што, сыне
абяцаньняў маіх?
3 Не давай жанчынам сілы тваёй, ані шляхоў тваіх
нішчыцелькам валадароў.
4 Не валадарам, Лемуэлю, не валадарам піць віно, і не
князям — сікеру,

5 каб не напіліся і не забыліся яны на напісанае, і каб не скрывілі суд для ўсіх прыгнечаных.
6 Дайце сікеру таму, хто гіне, а віно — засмучаным душою.
7 Няхай вып’е такі і забудзецца на бядоту сваю, і ня памятае больш цяжару свайго.
8 Адчыні вусны твае дзеля нямых, дзеля абароны ўсіх сіротаў.
9 Адчыні вусны твае, судзі праведна, абараняй прыгнечанага і беднага.
10 Хто знойдзе жонку дабрадзейную? Яна даражэй за пэрліны.
11 Пэўнае ў ёй сэрца мужа яе, і ён не застанецца без прыбытку.
12 Яна дае яму дабро, а ня зло, ва ўсе дні жыцьця свайго.
13 Шукае яна воўну і лён, і ахвотна працуе рукамі сваімі.
14 Яна падобная да караблёў купецкіх, здалёк прыносіць хлеб свой.
15 І ўстае яна сярод ночы, і раздае ежу ў доме сваім, і належнае служкам сваім.
16 Падумае яна пра поле, і купляе яго, з плоду рук сваіх закладае вінаграднік.
17 Яна падпярэзвае моцаю сьцёгны свае і ўмацоўвае рамёны свае.
18 Яна адчувае, што добры занятак яе, і сьветач яе ня тухне і ўначы.
19 Працягвае рукі свае да кудзелі, а далоні яе трымаюць верацяно.
20 Далоні свае адкрывае прыгнечанаму, і руку сваю працягвае беднаму.
21 Не баіцца сьцюжы для дому свайго, бо ўвесь дом яе ў кармазы?н апрануты.

22 Дываны? яна робіць сабе, вісон і пурпур — адзеньне яе.
23 У брамах [гораду] вядомы муж ейны, калі сядзіць сярод старшыняў зямлі.
24 Робіць яна палатніну, і продае яе, і дастаўляе паясы купцам Хананейскім.
25 Сіла і велічнасьць — адзеньне яе, і радуецца яна дню, што прыходзіць.
26 Яна адкрывае вусны свае з мудрасьцю, і міласэрнае настаўленьне на языку ў яе.
27 Яна пільнуе шэсьце дому свайго і ня есьць хлеба гультайства.
28 Устаюць дзеці ейныя, і называюць шчасьлівай яе, і муж ейны хваліць яе:
29 «Шмат было жанчынаў дабрадзейных, але ты пераўзыйшла іх усіх!»
30 Прывабнасьць падманлівая і прыгажосьць марная, але жанчына, якая баіцца ГОСПАДА, годная пахвалы.
31 Дайце ёй з пладоў рук ейных, і няхай справы яе ў брамах [гораду] хваляць яе.

# Новы Запавет і Кнігі Старога Запавету
# Belarusian New Testament and Books of Old Testament

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: беларуская

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Новы Запавет і Кнігі Старога Запавету

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2021-05-20

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 11 Nov 2022 from source files dated 29 Jan 2022
64be8e54-78c4-5277-8d28-9fc3e21a8e86